Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гомель. Як фарміруюцца склады акруговых выбаркамаў

09.09.2019 **Тэгі**: выбары-2019



ПРОМЫШЛЕННЫЙ ИЗБИРАТЕЛЬНЫЙ ОКРУГ №35

БАЙКОВ
Анатолий Прокофьевич
25 сентября 1965 года рождения, заместитель директора по экономическим и правовым вопросам общества с дополнительной ответственностью «ИНТРО», индивидуальный предприниматель, проживает в Гомеле, беспартийный.

БУРАКОВ
Виктор Александрович
24 июля 1983 года рождения, сотрудник охраны частного торгового унитарного предприятия «КрепИнст», проживает в Гомеле, член Либерально-демократической партии.

ГУРСКИЙ
Дмитрий Михайлович
15 декабря 1981 года рождения, заместитель генерального директора — директор завода КПД Гомельского домостроительного комбината, проживает в Гомеле, беспартийный.

ЛОБАН
Ростислав Сергеевич
8 февраля 1991 года рождения, аспирант Гомельского государственного университета имени Ф.Скорины, проживает в Гомельском районе, член Объединённой гражданской партии.

Кандыдаты Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №35 на выбарах 2016 года.

Доўгатэрміновы назіральнік кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" **Леанід Судаленка** правёў параўнальны аналіз складу выбарчай камісіі Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №35 з мінулымі парламенцкімі выбарамі 2016 года.

Паводле яго назірання з 13 сяброў акруговага выбаркама 7 чалавек раней працавалі ў гэтай жа камісіі, што складае больш за 50% ад агульнага складу. Старшыня і сакратар з'яўляюцца дзяржслужачымі, намеснік старшыні камісіі працуе дырэктарам школы, паведамляе "Гомельская вясна".

Тры з чатырох прадстаўнікоў палітычных партый прадстаўленыя ў акрузе паўторна, грамадскія аб'яднанні паўторна прадстаўлены БРСМ і "ветэранамі". Прадстаўнік ГА "Беларускі саюз жанчын" увайшоў у склад камісіі першы раз. Дзеючы дэпутат акругі пакуль свайго намеру вылучацца на паўторны тэрмін не выяўляе.

Старшыня акруговай камісіі №35 **Ала Андрушчанка** на выбарах 2016 года таксама кіравала выбарчай камісіяй. У склад камісіі вылучаецца ад грамадзян. У міжвыбарны перыяд чыноўніца працуе начальнікам аддзела арганізацыйна-кадравай работы адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля.

Намеснік старшыні камісіі **Сяргей Камыш** вылучаны ад РГА “Белая Русь”, на мінулых выбарах вылучаўся ад працоўнага калектыву ДУА “Сярэдняя школа №39 Гомеля”, дырэктарам якой ён і з'яўляецца.

Незалежны назіральнік адзначыў, што на мінулых выбарах намеснікам старшыні камісіі тут з'яўляўся вылучэнец ад грамадзян **Андрэй Сяргеенка**. У гэтым годзе 40-ка гадовы мужчына прызначаны гендырэктарам РУП “Гомельаблгаз”, што, па ўсёй верагоднасці, і паслужыла яго выбыцця з выбаркама.

Высунутая прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі сакратар камісіі **Наталля Шапарова** на мінулых выбарах таксама з'яўлялася сакратаром і вылучалася па прафсаюзнай лініі. Яна працуе ў раённым аддзеле адукацыі.

Чатыры члена камісіі прадстаўлены палітычнымі партыямі, прычым тры з іх ўваходзілі ў камісію і на мінулых выбарах. Камуністычную партыю прадстаўляе **Ларыса Вайтовіч**, Сацыял-дэмакратычную партыю Народнай Згоды **Сяргей Марцюхін**, Рэспубліканскую партыю працы і справядлівасці **Лідзія Свердлікава**. Прадстаўнік дэмакратычнай партыі - Беларускай партыяй левых Справядлівы свет уключаны ў камісію першы раз, яе прадстаўляе **Васіль Краўчук**.

Таксама, як і на мінулых выбарах грамадскія арганізацыі ў акруговым выбаркаме прадстаўлены БРСМ - **Сяргей Куцапаленка** і Беларускім ГА ветэранаў, якое прадстаўляе **Вольга Васільева**. Прадстаўнік ГА “Беларускі саюз жанчын” **Ірына Скварцова** ўвайшла ў склад камісіі першы раз.

Першы раз у склад акруговай камісіі №35 ад грамадзян выбраны **Алена Даўгяла**, **Аксана Касмінская** і **Наталля Сачыловіч.**

І хоць месцы працы сяброў сфармаванага выбаркама не публікуюцца, назіральнік **Леанід Судаленка** лічыць сябраў камісіі залежнымі ад улады, нават калі яны вылучаюцца ад грамадзян, як гэта робіць старшыня камісіі або ад партый і аб'яднанняў.

Назіральнік таксама адзначыў, што дзеючым дэпутатам у раёне назірання з'яўляецца 38-гадовы **Дзмітрый Гурскі**, які да абрання працаваў намеснікам гендырэктара домабудаўнічага камбіната. Ці будзе ён паўторна вылучаць сваю кандыдатуру ў акрузе пакуль невядома. На дадзены момант у акрузе зарэгістравалі ініцыятыўныя групы беспартыйныя 32-гадовы **Фёдар Бусел** ды 45-гадовы **Андрэй Пуканаў**. На выбарах 2016 года ў раёне назірання вылучаліся чатыры кандыдатуры.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары".

Навіны кампаніі ў фэйсбуку, твітэры і на Тэлеграм-канале.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?

У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык



ГАЛОЎНАЕ

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Я не асуджаная, я ў палоне". Маналог Алены Лысковіч — былой палітзняволенай пасля "хіміі"

Жанчыну асудзілі на 1,5 года калоніі за ўдзел у Маршах

"Гэта атрад АМАП "пережестил": як у Бабруйску пераследавалі мужчыну з інваліднасцю

Палітзняволеную Яну Пінчук, якую экстрадавалі з Расіі, асудзілі да 12 гадоў калоніі

У Варшаве адбылася прэзентацыя інсталяцыі "1525", прысвечанай беларускім палітвязням (фота)

Шэсць гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму прысудзілі айцішніку з Брэста

Праграміста Аляксандра Лагуту асудзілі да двух з паловай гадоў "хіміі" за "паклёп" на Лукашэнку

Ціск на палітвязняў, папаўненне ў "спісе экстрэмістаў": хроніка пераследу 3-5 чэрвеня

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

За распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў і абразу Лукашэнку асудзілі жыхара Ліды

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre Memorial

Московская Хельсинкская Группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY